# ЛІРЫЗМ, ГЛЫБІНЯ, МІЛАГУЧНАСЦЬ

**5-га лістапада адбылося чарговае выступленне члена СПБ, беларускай паэтэсы, педагога, лаўрэата Прэміі імя А. І. Дубко Таццяны Яцук у Гродне.**



Гэтым разам пісьменніца выступіла ў Гродзенскім абласным інстытуце развіцця адукацыі. Тут аўдыторыю творцы склалі гродзенскія калегі-настаўнікі беларускай мовы і літаратуры. У межах творчай сустрэчы адбылася прэзентацыя новага зборніка вершаў Таццяны Мікалаеўны «Прага цішыні» *(Мінск, «Беларусь», 2025)*.

Прадставілі госцю старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Людміла Кебіч, а таксама метадыст цэнтра агульнай сярэдняй адукацыі Святлана Гузава.

У аўтарскім прачытанні прагучала паэзія Таццяны Яцук. Пачутае нікога не пакінула абыякавым. Ключавым момантам выступлення паэтэсы стала дэкламацыя яе паэмы «Калдычэва». Твор, як і ўвесь новы зборнік, закранае тэмы Вялікай Айчыннай вайны, гістарычнай памяці беларусаў, неўміручай пашаны трагічным старонкам мінулага. Былі адзначаны мілагучнасць, меладызм паэзіі Таццяны Мікалаеўны. Гэтыя якасці творчага майстэрства госці пацвердзіў шэраг песень, напісаных на яе словы.

Прысутныя выказалі шмат цёплых слоў паэтэсе. Шырокі тэматычны спектр твораў, народная самабытнасць мовы, лірызм, філасофская глыбіня аўтарскіх паэтычных радкоў уразілі прафесіяналаў, расчулілі і напоўнілі святлом душы людзей. А яшчэ паэтэса прадэманстравала і свой патэнцыял наватара, смелага эксперыментатара… Стала зразумела, што такіх цікавых сустрэч з сучаснымі літаратарамі вельмі не хапае сучасным педагогам. А роднае мастацкае слова ўжо не раз даказвала сваю эфектыўнасць у справе патрыятычнага выхавання моладзі. Таму Людміла Антонаўна

Кебіч прапанавала праводзіць такія літаратурныя сустрэчы ў Гродзенскім абласным інстытуце развіцця адукацыі на пастаяннай аснове (для зручнасці – у дні школьных канікул). Тым больш, што такая традыцыя тут калісьці ўжо існавала. Ініцыятыва яе адрадзіць атрымала ўсеагульнае адабрэнне. А паэтэса атрымала шмат станоўчых эмоцый, порцыю натхнення і вядома, новых чытачоў, сапраўдных шчырых прыхільнікаў яе таленту. Мерапрыемства скончылася традыцыйнай аўтографсесіяй.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса, педагог Таццяна Мікалаеўна Яцук падчас свайго выступлення перад гродзенскімі настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры. Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі. 5 лістапада 2025 года.



Людміла Кебіч, Таццяна Яцук, Святлана Гузава


ГРОДЗЕНСКАЯ


ТАЦЦЯНА ЯЦУК
ПРЫГОДЫ



Алфавітная музыка слоў
Тацяна Яцук
Маладосць на выданні
Сашыны прыгоды


ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
ЛЕТА


Алфавітная музыка слоў
Маладосць на выданні
Сашыны прыгоды





ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

ГрОИРО